98,1 FM
BIAŁORUSKIE RADIO RACJA
www.radioracja.pl www.racyja.com
Białoruskie Centrum Informacyjne Sp. z o.o.
Białoruskie Radio RACJA
ul. Ciepła 1/ 7, 15-472 Białystok
NIP 521-29-67-459
REGON 013039957 KRS 0000253960
e-mail: radioracja@wp.pl
tel. do sekretariatu +48 85 654 51 93
tel. do sekretariatu +48 85 676 80 20
tel. do redakcji +48 85 654 50 93
tel. do studia +48 85 654 51 51
fax +48 85 676 80 25

BIAŁORUSKIE CENTRUM INFORMACYJNE Sp. z o.o.
Białoruskie RADIO RACJA
15-472 Białystok, ul. Ciepła 1/7
tel. +48 (085) 65-45-193, NIP 521-29-67-459
1-

Беласток, 2015-05-19

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Шаноўная Спадарыня Міністр
Лілія Станіславаўна Ананіч

У сувязі з электронным пісьмом Вашага міністэрства № 02-01-06/485 ад 15.05.2015 г. і пастаўленымі там запытамі і закідамі ў адрас Беларускага Радыё Рацыя ў Беластоку і сайта нашага радыё www.racyja.com, сцвярджаем наступнае:

- Тое, што патрабуе ад нас міністэрства інфармацыі ў справе адрасу, ёсць на нашай інтэрнэт-старонцы: адрас: 15-472 Беласток, вул. Цепла 1/7, тэл. сакратарыята +48 85 676 80 20, fax: +48 85 676 80 25.

- Беларускае Міністэрства замежных спраў, куды нашы карэспандэнты кожны раз падаюць заяўкі на акрэдытацыю, каб працаваць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, атрымоўвае ўвесь пакет дадзеных пра вяшчанне, структуру, уласніка – ўсё гэта кожны раз падаецца менавіта ў МЗС. Дагэтуль нашыя журналісты не атрымалі аніводнай акрэдытацыі. Карыстаючыся нагодай, звяртаемся да Спадарыні Міністр Ліліі Станіславаўны Ананіч паспрыяць у размовах з беларускім МЗС, каб тое змяніла сваю пазіцыю і падыход да нашага радыё. Спадарыня міністр дасканала разумее, што такая акрэдытацыя зняла б шэраг пытанняў юрыдычнага кшталту ў сувязі з працай журналістаў – фрылянсераў і вобразам Беларусі ў свеце. Вось асноўная даведка пра нашае радыё, якая ад гадоў знаходзіцца ў беларускім МЗС пра нас:

**Даведка аб сродку масавай інфармацыі – Таварыства з абмежаванай адказнасцю "Беларускі інфармацыйны цэнтр / Беларускае радыё Рацыя".**

Таварыства з абмежаванай адказнасцю "Беларускі інфармацыйны цэнтр / Беларускае радыё Рацыя" было створана 15 лютага 2006 года ў г. Беластоку (Рэспубліка Польшча). Ліцэнзія на радыёвяшчанне: № 243/99-R, выдадзеная старшынёй Краёвай рады па радыё і тэлевяшчанні 30 ліпеня 1999 года, дзейнічала да 29 ліпеня 2009 года. Чарговая ліцэнзія № 043/K/2009-R дзейнічае да 29 ліпеня 2019 года.

67% акцый Таварыства з абмежаванай адказнасцю "Беларускі інфармацыйны цэнтр/Беларускае радыё Рацыя" валодае грамадская арганізацыя "Беларускі саюз у Польшчы" (г. Беласток, вул. Заменхофа, 27).

З 27 красавіка 2006 года пачалося вяшчанне на частаце 105.5 ФМ у г. Беластоку. Адначасова з гэтым вяшчанне вялося на кароткіх і сярэдніх хвалях. З 15 лістапада 2007 года вяшчанне пачало весціся на частаце 98.1 ФМ на тэрыторыі Падляшскага ваяводства Рэспублікі Польшча. З канцом 2009 года вяшчае таксама на частаце 99,2 ФМ з Белай Падляшскай.

Мэтавая аўдыторыя нашага СМІ – грамадзяне Рэспублікі Беларусь і этнічныя беларусы Падляшскага ваяводства Рэспублікі Польшча, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія цікавяцца грамадска-палітычным і сацыяльна-культурным жыццём Рэспублікі Беларусь і краін-суседзяў.

Галоўнай мэтай ТАА "Беларускі інфармацыйны цэнтр / Беларускае радыё Рацыя" з'яўляецца стварэнне трансгранічнага радыё, якое дасць грамадзянам Беларусі і Польшчы доступ да аператыўнай інфармацыі аб падзеях і развіцці сітуацыі ў Беларусі, Польшчы, Еўрапейскім Саюзе і свеце.

Прадстаўніцтваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ТАА "Беларускі інфармацыйны цэнтр / Беларускае радыё Рацыя" не мае.

Сайт racyja.com з'яўляецца неад'емнай часткай радыё. Сайт поўнасцю беларускамоўны і з'яўляецца важнай часткай нацыянальна–культурна–духоўнага жыцця ўсіх беларусаў. На жаль, пісьмо Вашага ведамства да нас толькі на рускай мове, так як і да ўсіх астатніх, хто атрымаў такія лісты, лічу непрымальным для тытульнай назвы дзяржавы і ягонага народу. Са здзіўленнем сцвярджаем, што сайт такога Міністэрства як Вашае, ёсць толькі і выключна расейскамоўным. І як гэта маецца да абавязваючых законаў пра моўную роўнасць у Рэспубліцы Беларусь? Уключыўшы нават версію для слабавідучых, мы не змаглі знайсці магчымасці, каб спрацавала беларуская версія сайта. Мне, як прадстаўніку беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, такое стаўленне да роднага і беларускіх законаў здаецца зняважлівым!

Калі Міністэрства інфармацыі выносіць нам "папярэджанне" за "распаўсюд неаб'ектыўнай інфармацыі, якая можа нанесці шкоду дзяржаўным і грамадскім інтарэсам", дык просім канкрэтныя прыклады. Калі ў эфіры і сайце нашага радыё мелі месца такія здарэнні? Такі сур'ёзны юрыдычны закід без прыкладаў, лічым проста палітычна матываваным. Ці якая-колечы крытыка адмоўных працэсаў у Рэспубліцы Беларусь на старонках "Савецкай Беларусі" ці дзяржаўным радыё-тэлебачанні будзе выклікаць такую ж рэакцыю Вашага ведамства? Не гаворачы пра рэгіянальныя медыя.

Мы са здзіўленнем прынялі Ваш ліст яшчэ па адной прычыне. Мы дзейнічаем законна ў Рэспубліцы Польшча, дзейнічаем згодна з польскім медыйным заканадаўствам. Вяшчаем, маем ліцэнзіі згодна з усімі патрабаваннямі. Не падлягаем непасрэдна беларускаму заканадаўству. Аднак, маючы на ўвазе Ваш запыт, як

кожнага зацікаўленага існаваннем Беларускага Радыё Рацыя, згодна з прынятымі агульначалавечымі і гандлёвымі прынцыпамі, дасылаем адказ на Вашыя пытанні. Нашая дзейнасць празрыстая і менавіта павага да людзей, нашага слухача і чытача ёсць самай важнейшай справай у журналісцкай працы Беларускага Радыё Рацыя.

З павагай
Яўген Вапа
Старшыня ўправы Беларускага Радыё Рацыя

PREZES ZARZĄDU
REDAKTOR NACZELNY
Eugeniusz Wappa

Да ведама:
Беларуская асацыяцыя журналістаў - press@baj.by
Медыя (navinyby@belapan.com, charter97@gmail.com, welcome@tutby.com, nn@nn.by, belpartisan@gmail.com, radiosvaboda@gmail.com, info@belsat.eu, abjektyu@belsat.eu, viasna@spring96.org, mail@freeregion.info)
Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – press@president.gov.by

BIAŁORUSKIE CENTRUM INFORMACYJNE Sp. z o.o.
Białoruskie RADIO RACJA
15-472 Białystok, ul. Ciepła 1/7
tel. +48 (085) 65-45-193, NIP 521-29-67-459